# Бальшавіцкай самакрытыкай выкрыем свае памылкі

## і яшчэ больш загартуем свае рады для барацьбы за соцыялізм

Савецкая Беларусь—краіна дыктатуры пралетарыяту пад кіраўніцтвам Кампартыі бальшавікоў Беларусі шпаркім тэмпам вырашае задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

Разам з усім Савецкім Саюзам, Савецкая Беларусь набыла за гады рэвалюцыі надзвычайныя размахі і тэмпы сацыялістычнага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця, што служыць доказам таго, што задача Савецкае ўлады—дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны—можа быць выканана ў найкарацейшы гістарычны тэрмін.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б рабочая кляса Беларусі, апіраючыся на сялянскую беднату, у саюзе з серадняком, супроць прадраканьняў правых ухілістых, вырашае ўсе задачы сацыялістычнага будаўніцтва, праводзячы рашучы курс на шпаркі тэмп індустрыялізацыі і на сацыялістычнае ператварэньне сельскае гаспадаркі на шляху калектывізацыі і пабудовы буйных савецкіх гаспадарак.

КП(б)Б рашуча выкрывае праявы беларускага і ўсялякага іншага шавінізму і, «не взирая на лица», б'е па канкрэтных носьбітах такога. Ачышчаючы партыю і савецкі апарат ад нягодных элемэнтаў, КП(б)Б на зьмену ім высоўвае тысячы рабочых, батракоў і бедняков-сялян.

Ролю КП(б)Б у гэтай барацьбе верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б вызначае наступным чынам: «Шырокае разгортваньне работы пралетарыяту і партыі ў справе выкананьня генэральнага пляну сацыялістычнай рэконструкцыі і наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі пры ўмовах абвастрэньня клясавага змаганьня і няўхільных цяжкасьцяй рэконструкцыі,—прад'яўляюць да авангарду пралетарыяту — камуністычнае партыі — рад вельмі сур'ёзных запатрабаваньняў у справе ўмацненьня яе клясавае баявую лінію партыі, супроць канкрэтных носьбітаў правага ўхілу. «Толькі бальшавіцкая самакрытыка»—гаворыць гэтая адозва — «толькі сьмелае прызнаньне сваіх памылак забясьпечаць своечасовае выкрыцьцё скажэньняў лініі прэтыі і далейшы поступ уперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва».

У рэвалюцыйнай барацьбе партыя вымагае ад нас прымаць заўсёды актыўны ўдзел у гэтай рэвалюцыйнай барацьбе. Я лічу сваёй палітычнай памылкай тое, што не выступаў актыўна па-за межамі ЦК, у барацьбе за генэральную лінію партыі, а абмежаваўся толькі ўдзелам у прыняцьці пастаноў ЦК па барацьбе з правым ухілам і нацыянал - апартунізмам, і лічу зусім законнымі тыя закіды, што робяцца мне з прычыны адсутнасьці з майго боку актыўных выступленьняў у барацьбе супроць правага ўхілу і супроць праяў нацыянал - дэмакратызму, тым больш, што мае адкрытыя выступленьні па іншых пытаньнях мелі месца. Гэтыя закіды зьяўляюцца тым больш сур'ёзнымі, што сярод раду маіх папярэдніх выступленьняў як пісьмовых, так і вусных, ёсьць права-апартуністычныя і нацыянал - апартуністычныя памылкі, прычым гэтыя памылкі мною своечасова ня былі выпраўлены.

Ня менш рашуча выкрыты права-апартуністычныя памылкі Белсампрамкаапэрацыі, што прыводзілі да засьмечаньня сампрамкаапэрацыі кулацкімі і нэпманскімі элемэнтамі.

Выяўлены таксама памылкі мінулага кіраўніцтва Наркамасьветы, якое не забясьпечыла цьвёрдае клясавае лініі на культурным фронце, не давала рашучага адпору варожым нам ідэалёгіям, вельмі слаба займалася выхаваньнем і падрыхтоўкай новых пралетарскіх кадраў.

Я, між іншым, стараўся высьветліць памылкі Жылуновіча, які сярод раду сваіх іншых грубейшых памылак, асучэньні ня вычарпалі ўсіх пытаньняў, я лічу абавязковым даць тлумачэньні пытаньнем па асабістым маіх памылках.

Спыняюся на пытаньні, ці ёсьць у мяне памылкі. Так, яны ёсьць.

Аднэй з важнейшых сваіх памылак у барацьбе з правым ухілам я лічу наступную: 20 кастрычніка 1928 г., робячы даклад на 2-м зьезьдзе таварыства «Прэч няпісьменнасьць».

Я ў сваім дакладзе даў указаньні карыстацца тым артыкулам тав. Бухарына, які зьяўляўся плятформаю правага ўхілу ў яго барацьбе супроць генэральнай лініі партыі. Праўда, гэты даклад ня быў надрукаваны. Аднак, я добра разумею, што мне трэба было своечасова адкрыта адмовіцца ад данай установкі. Тым больш гэта было патрэбна, што антыпартыйная сутнасьць артыкулу тав. Бухарына «Записки экономиста». была выяўлена і раскрыта перад тварам ўсей партыі.

Такім чынам, аб'ектыўна стварылася палажэньне, што я, разам з правымі ўхілістымі, абараняю іх няправільныя права-апартуністычныя ўстаноўкі.

Я заяўляю з усёй катагарычнасьцю, што я зрабіў вялікую памылку ў тым, што я несваячасова асудзіў свае няправільныя ўстаноўкі і тым аб'ектыўна даў зброю ў рукі правых ухілістых, у рукі ворагаў нашай партыі і савецкае дзяржавы. Гэту сваю грубейшую палітычную памылку я самым суровым чынам асуджаю.

Другой маёй буйнейшай палітычнай памылкай, якая аб'ектыўна зьяўляецца права - апартуністычнай памылкай, я лічу свой артыкул: «Пявец барацьбы і барацьбіт за Савецкую Беларусь», што мною быў прысьвечаны да дваццацігодзьдзя літаратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага—З. Жылуновіча («Полымя», сьнежань мес. 1928 г. № 10).

Палітычныя памылкі Жылуновіча вядомы і асуджаны КП(б)Б. Сам Жылуно-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы